Беларускі Шлях

Рэдакцыі Ново-Серэбуская 29
Адміністрацыі Захараўская «Юбілейны Дом».

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поўдня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаўкай да дому у Менску на 1 месяц 3 руб.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб. на апошняй—50 к п

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 96. Менск. Субота 17 жніўня 1918 г. Год I

„Контакт“.

Смаленскія справы.

Калі «таварыш Ландэр», быў не тутака усеможным народным камісарам, то адзін з адзін з яго таварышаў, сама «народны камісар» на ...танне члена пэўнай беларускай арганізацыі, ці надчыноцца мейсцовыя уладыкі уладкам тагды ішчэ Пецярбургам, віўпятна прамычэў: «мда, мы с німі в контакте»... Цікавая рэч з гэтым. «контактом» пiдаўпа была у Смаленску.

Цэнтральны «совнарком» адзыўся ішчэ будучы у Петраградзе на арганізацыю Беларускага Нацыянальнага Камісарыяту, пры ім, каторы с часам зрабіўся цэнтральным для такіх жа камісарыятаў пры мейсцовых совнаркомах у беларускіх губэрнях окупованых большэвікамі, т. е. Віцебскай часьці, Магілёўскай і Смаленскай. У Віцебску, як мы чулі, такі комісарыят ёсьць і шмат робіць. Захадзіліся ...ны і Смаленскія беларусы, каб мець свой камісарыят. Інстытуцыя гэта патрэбная і пры цяперашніх варунках мае чиста ратунковы характэр. Пастанова аб Смаленскім камісарыяце разглядалася у Цэнтральным Совнаркоме у Маскве і была ім дапушчана, а нахулак быў зацьверджаны, ці, як кажуць украінцы: «начальство на начальство паело».

Смаленскае «начальство», вядомыя па чынасьці у Менску А. Мясьнікоў, І. Рэзеу, рэдактар «Звезды» В. Кнорын, М. Калмановіч, І. Алібеў, І. Рэйнгольд і Нікель, здецца, пакуль што узялі верх над маскоўскім начальствам—беларускі комісарыят афіцыяльна у Смаленску ні існуе. Далася гэтая перамога аднак ні адразу і ні без ахвяры на забарону арганізаваць усяны камісарыят, беларусы выставілі дазваленне ад цэнтральнага ураду, саслаўшыся разам с тым на існаванне у Смаленску камісарыятаў іншых нацыянальнасьцяў, латышскага, літоўскага, польскага. Тагды, каб беларусы ні мелі на што спасылацца, былі зачынены і гэтыя камісарыяты, абы-б ні дапусьціць арганізацыю беларускаго.

Дазваленне-ж цэнтральнаго совнаркома відаць у Смаленску ні указ.

Афіцыяльна, такім чынам, тут беларускаго камісарыяту німа, хаця на яго утрымание з Масквы выдаюцца грошы і гэтыя грошы законным спосабам расходуюцца у Смаленску.

Прынцыпіяльнае становішчо мейсцовых совнаркомцыкаў у гэтым пытанні асьвятляе у газэці гэтай шайкі ие тэорэтык, б. рэдактар Менскай «Звезды» Л. Кнорын, подлуг якога «дамаганне правоў усіх народаў на самаазначэнне у соцыялістычнай рэспубліцэ Радаў, ёсьць дамаганнем рэакцыйным скіраваным процiу работніцтва», з якім змагацца трэба «ні лібэральнічаннем і патуранием, але умацаваннем работніцкай дыктатуры, выступаючы проці буржуазных нацыянальных рухаў, так як мы выступалі бы проці іх, каб яны ні хаваліся з нацыянальныя прапоры».

«Заклік самаазначэння народаў мы павінны выкасываць с праграмы Расп Радаў», павучае «т.» Кнорын «т.» Леніна...

Агульныя весткі.

БЭРЛІН. 14 гм. «Вольф». Балгарскі пасол у Маскве Сьцепан Чапрашнікаў, турэцкі міністр Халіб Кэмаль-Бэй і Алі Бэй з турэцкай місіі у Маскве прыбылі, подлуг «Voss. Ztg.», у Бэрлін.

ПАРЫЖ. 12 гм. «Havas». Пры ўмовы Жыронды мае быць настаўлены памятнік на успамін умешання Амэрыкі у вайну. Проэктуецца, што Вільсон палажыць перны камень помніка.

ГААГА. 11 гм. Ангельскія афіцэры лётчікі у таварыстве 2 механікаў пераляцелі з Англіі у Эгіпет, меўшы у дарозі 2 астаноўкі.

АМСТЭРДАМ 13 гм. Вольф Амэрыканская сталая армія, народная гвардыя і народная армія і корпусы рэзэрву злучаны у адну арганізацыю, якая называецца «Армія Злучаных Штатаў. Паведамляе аб гэтым «Таймс». Прыйманне ахвотнікаў у армію і флот цяпер зьпесважнепо.

ВЕНА. 13 гм. «Вольф». «N. Wien. Tagbl.» паведамляе: Так як бягучыя справы патрэбуюць ужо цяпер сталай рэпрэзэнтацыі польскаго ураду у Вене, то дзеля гэтаго на час, пакуль справа ні скончыцца урадовым спосабам у зьвязку з развагай польскаго пытания, у Вене істнуе поурадовая рэпрэзэнтацыя, шэфам якой ёсьць гр. Стафан Пржездзецкі і ёсьць рэфэрэнты у справах гандлю, права, адміністрацыі і прэссы. Апрача гэтай істнуюць польскія рэпрэзэнтацыі у Вэнгрыі, у Кракове і Львове.

ЛЕНДАН 12 гм. Аг. Рэйтэра мае весткі, што з ініцыятывы прэзыдэнта амэрыканска-работніцкаго зьвязку, Самуэля Гомпэрса, каторы мае хутка прыехаць у Англію, ад 17 да 19 верасьня у Лёндане будзе соцыялістычная конфэрэнцыя панствау коаліцыі. Як чуваць, апрача амэрыканскіх, як і на конфэрэнцыю 26 чэрвеня, запрошаны Францускія, Бэльгійскія, Італьянскія, Сэрбскія, Грэцкія, Канадскія і Расійскія партыі.

ЦУРЫХ, 12 гм. «Zur. Morg. Ztg.» мае ведамасьці, што урадовыя колы коаліцыі ні зьбіраюцца абвуяць вайны Расіі, бо уважаюць у большэвікоў толькі партыю, а ні прадстаўніцтво рускаго народу.

Весткі з Расіі.

МАСКВА, 13 гм. «Вольф». Урад казацкай Донской Рэспублікі, на чале з атаманам, ген. Красновым, абвявіў ні поўную мобілізацыю.

МАСКВА. 12 гм. «Волф». Подлуг урадоваго адчоту аб сытуацыі на Мурманскім фронце, коаліцыйныя войскі пасьля ніпрарыўных шасьці-дзённых баёў перасталі насувацца далей і адступілі.

Настрой расійскаго войска добры. Каля Архангельску савецкае войско мае прыязную сытуацыю.

БЭРЛІН, 13 гм. «Северная Коммуна» паведамляе: З Мурманскаго округу у Кронштадт прыбылі матросы, каторыя аповядаюць, што тамака ўзарваны усе масты і зніштожаны жалезьвічныя лініі.

Мурманскае насяленне варожа адносіцца да ангельцаў і француваў.

Вярбоўка ангельцаў дала нівялікую лічбу маладзежы.

Расійскія караблі перавожаны транспорты і крэйсэр Аскодьд сакводстрованы ангельцамі, матросы і ахвіцэры змушаны да выезду у глыб Расіі, наскольку-б ні хацелі астацца на ангельскую службу.

Харчовыя склады на Мурмане зрабованы ангельцамі, каторыя у стасунку да расійцаў трымаюць сябе так ворага, як толькі можна аб гэтым задумаць.

Тое, што магчыма.

Слово гэто тое прэдзьвесьце да чына, каторае паказывае чалавеку што рабіць і куды ісьці. Слово гэто тыя дрожджы, на якіх вырастаюць у нэтоўпах людзкіх розныя ідэі, як добрыя, так і благія. Разумнае слово сказанае у належачы час прыносіць шмат карысьці і служыць рулём да палепшэння чалавечаго жыцця да прагрэссу культуры. За трапнае натхнёнае слово цэлыя массы людзей, цэлыя народы ідуць на сьмерць.

Слово — самая багатая і наймацнейшая узброя у чалавека.

За час вайнавыя у расійскай імпэрыі сыпаліся іскрамі я каскады слоў на права і на лево. Праз агітатараў розных, праз дэкрэты, праз часопісы, праз праграмныя натокі слоў зэплывалі у розныя глыбокія шчэліны. Апьянялі мазгі людзкія розныя галаваломныя блыскучыя і наіўныя абэцанкі раёў на зямлі. Ад гэтых раёў кружыліся галовы, рабіліся адважныя і страшэнныя падзеі, якія афарбавалі страніцы гісторыі сучаснай чалавечай трагедыі новай крывёю, дапаўняючы моро сьлёз і пакуты яшчэ болей.

Усё гэто дзеялося дзеля таго, што слово лёгка выгаварываецца а чын ні лёгка робіцца. Словам мяжы німа, а чыну ёсьць цьвёрдыя можа— магчымасьць выпаўнення. Вось на гэтай самай мяжы разгарачаныя людзі пабівалі сабе ногі аб камяні і ражоны, а далей ні маглі ісьці наперад. Тут у іх пачалася тая вялікая суматоха и паразуменне і людзі папалі ад гарачаго полымя у халодную ваду.

Пад гіпновам слоў знайходзіліся разам з другімі і беларускія масы. Польскія «ма-церкы» заводзілі па нашай зямлі свае варшаўскаго духу школы, католікам-беларусам убіваўся да канца у галаву «Ойчызны» ухналк а па Беларусі ішло праклямаванне свабод, а тут у коммуністычны спосаб рашалася зямельная справа, а з беларусаў мало хто стараўся сеяць беларускае друкаванне слово, асьведамляць вёску у нацыянальнай ідэі. Нават у тых школах у Менску і ваколіцы, каторыя перайшлі пад кіраванне беларусаў мало глядзелі за тым, каб дзеці атрымалі адукацыю у беларускім духу. Мало хлапаціліся аб тым, каб вучыцельскія пэрсоналы былі заноўнены беларусамі. Нашыя беларускія газэты мелі вельмі мало падтрымання ад тых людзей, каторыя маглі-бы у гэтым кірунку шмат чым памагаць і дзеля гэтаго газэты нашыя, як самы нэрв нашых нацыянальных ідэй, марнелі, час ад часу перарывaліся, і істнавалі у вельмі кепскіх варунках.

Гэто ўсё адкладывалося на лепшыя часы, бо гэтымі «драбнiцамі» часу ні было займацца.

А мы спадзяемся, што ця-

пер час таптаньня на адным мейсцы у водавароце слоў мінуў і нашыя першыя людзі ужо бяруцца за тое, што магчыма: арганізуецца беларускі унівэрсытэт у Менску, курсы для беларускіх вучыцялёў, пачалі друкаваць школьныя падручнікі, усе справы узяты у рамках паводлуг цяперашніх абставаў жыцця і вось цяпер пасьля усьмірэньня рэвалюцыйнага пылу, мы с пэўнасьцю чэкаем у беларускай справе рэальнай творчасьці.

З. Бядуля.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Пачатак заняцця у местовых школах. З 20-го жніуня адкрываецца прыем вучняу у местовыя пачатковыя і вышэйшыя школы. Пад загадам местовай управы знаходзяцца 33 пачатковыя школы, 7 вышэйшых і 1 гандлевая школа. Школы распрэдзеляюцца па нацыянальнасьцям у гэткім парадку:

Вялікарускія.

№ 1—Александроуская, 47.
№ 2—Ракоуская, 8.
№ 3—Вяселая, 26.
№ 4—Канюшэнная.
№ 5—Каломенская, 38.
№ 6—Ново-Маскоуская, 19.
№ 7—
№ 8—Шырокая.
№ 9—Ніжняя-Ляхоука, 8.
№ 10—Старажэуская, 25.
№ 11—Серэбранка.
№ 14—Мікалаеуская, 33.
№ 15—Ракоуская
№ 16—Багадзельная, 28.
№ 23—Захароуская, 40.
№ 26—Захароуская, 121.
№ 27—Круглы заулак.
№ 33—Рог Нова-Маскоускай і Нова-Раманаускай.

Беларускія.

№ 10—Каломенская, 38.
№ 20—Вяселая, 26.
№ 21—Захароуская, 121.
№ 22—Александроуская, 36.
№ 28—Залатагорская, 2.
№ 29—Серэбранка, Юго-Западная, 10.
№ 30—, № 31— } Дземеньцьеускі заулак, 4.

Жыдоускія.

№ 17—Александроуская, 36.
№ 18—Александроуская, 31.
№ 24—Замечэтны завулак, 5.
№ 25—Белацэркоуная, 9.

Польскія.

№ 12—
№ 13—уборкі 2-ая Сергеуская, 10.

Татарская.

№ 23—Б.-Татарская, д. Багдановіча. Абучэнне у пачатковых школах *безплатнае.*

Вышэйшыя пачатковыя школы.

№ 1—Багадзельная, 23.
№ 2—
№ 3—Александроуская, 32.
№ 2—(жыдоуская) Нова-Маскоуская, 60.
№ 5—, № 6— } Александроуская. 21.
№ 7—Мало-Манастырскі з., 31.
№ 8—Гандлевая школа Нова-Маскоуская.

У вышэйшых пачатковых школах плата за навучэння 60 руб. у год, якая уносіцца у два срокі і асобая прыплата за навучанне інастраннай мове.

У першую чаргу прынімаюцца без эгзамена вучні, якія акончылі пачатковую школу. Ва усіх пачатковых школах саумеснае навучанне уводзіцца с гэтаго году толькі пакуль што у 1-ым клясcе.

Заняція у школах пачнуцца с 1-го верасьня.

У земстві. На XII надзвычайным сходзі Менскаго Губ. земства пасьля палевых работ будуць разгледаны вось якія справы і пытанні:

1. Абсуджэнне паказанняу акупацыйных уласьцей адносьне перэгляду сьметы на 1918 г.
2. Пацьвярджэнне таксы за патравы і лясныя парубкі.
3. Харчавое пытанне.
4. Санітарнае меропрыяцце глаунае барацьба с халерай.
5. Маючыя быць выбары гласных у земскія установы менскай губэрніі.
6. Арганізацыя юрыдычнай помачы насяленню менскай губ.
7. Злучэнне мерапрыяцціу па часці гаспадарскай і культурнай дзеяльнасьці земствау района акупацыі.
8. Даклад кантрольна-рэвізыйнай камісіі па ліквідацыі установау Усерасійскаго Зем. Саюзу.
9. Дагляд дзяцей сірот і падкідышау.
10. Даклад дэлегацыі да вышэйшых нямецкіх уласьцей, выбранай на VII чарговым Губэрнскім Земскім сходзі.
11. Даклад вэтэрынарнаго аддзелу Управы аб мерах барацьбы с эпізоотыямі.

Да епархіяльнаго зьезду. Сфарміраваны перадзьезныя камісіі, якія працуюць над падгатоукай матэрыялау для маючаго быць 30 жніуня епархіяльнаго зьезду. Болей інтэнсыуна працуе камісія па рэформе епархіяльнаго упраулення.

Яшчэ аб вучыцельскім інстытуці. Пытанне аб рэвакуацыі вучыцельскаго інстытуту з Ярослауля, дзеля прыбліжэння вучэбнаго часу, прыймае асобую вастрату, тым болей, што, як кажэ дэлегацыя інстытуту, астаеца на далей у зруйнаваным большэвікамі Ярослаулі німа ніякай магчымасьці. Беларускі Нар. Сэкрэтарыят прыймае блізкае вучасьце у тым кірунку, каб інстытут пераехау у Менск.

Пераход. Гэтымі днямі Бел. Нар. Сэкрэтарыят с цяперашняго памешкання, Захароуская 43, пераходзіць у поуным складзі у Юбілейны Дом.

Беларускае Таварыство апекі гісторыі і літэратуры. У Менску арганізуецца Белар. Т-во апекі літэратуры і гісторыі дзеля ахраны памяткау беларускаго пісьменства, калекцыенавання тых з іх, якія будуць ахвяраваны т-ву, стварэння мажлівых становішч для працы беларускіх пісьменнікау, гісторыкау і археалегау, арганізацыі спэцыяльнаго фонду дзеля падмогі літэратарам, гісторыкам і г. д.

Да земскіх выбарау. Хутка маюць быць выбары галасных земства, да 1/1-1919 г. па закону павінно быць адчынено земство новым складам, маючыя быць выбары ужо у другі раз для дэмократычнаго земства. Першыя выбары прайшлі спакойна ні стольки дзеля падгатоукі, адзеля таго, што да мамэнту выбарау большэвікі, на зруйваушыя амаль увесь дзержауны лад і грамадзянскае жыцце, былі яшчэ слабы і ні маглі шкодзіць ходу саміх выбарау.

Зьменьшэнне цэн на хлеб. За 3 апошнія дні цэна на хлеб у вольнай прадажы адразу упала да 1 р. 40 к. за фунт.

Можна чакаць с прычын новаго ураджаю падзення цэн на жыто і картоплі.

Апрача таго у хуткім часе павялічываецца хлебны паек да $3^{1}/_{2}$ фунта у тыдзень.

Сярод арэндатарау. Камароускім вотчынікам пачаты проціу 40 арэндатарау зыскі за ніузнос нідаімкі, запушчанай за час вайны. Апрача таго павялічываюцца стаукі за вучасткі пад засевы.

Беларускі Народны Тэатр. У нядзелю 18 жніуня в «Беларускай Хаце» будзе спэктакль Беларускаго Народнаго Тэатру. Іграць будуць «Кветку папараці» фантастычны абраз паводле паэм К. Буйло і Я. Купалы усцэнізаваны С. К. і Ф. А.

Праграму спэктакля запоуніць «Мядзьведзь» сцэнічны жарт у 1 акце А Чэхова (пераклад з расійскаго).

Пачатак спэктаклю а $8^{1}/_{2}$ у веч. Пасьля спэктаклю танцы да 2 гадз. у начы.

Весткі с краю.

М. Пасадзець. Віленскай губ. Вілейскаго пав. Жніво ідзець у нас вельмі добра. На жыто сёлята ураджайны год. Бульба так сама добра расьце. Адно — у часе дажджоў шмат сена пагніло у нашай ваколіцы.

Хутка зноў адчынецца Пасадзецкае Народнае Вучылішчо, каторае было зачынено за увесь час вайны. Даўно пара, а то польскія школкі запаўняюць цэлыя ваколіцы. Нават у адным мейсцы каля нас быўшы крайскі паліцэйскі стражнік зрабіўся вучыцелям польскай школы.

Аб беларускай справе у нас троха чулі. Час-ад-часу хадакі пехатой хадзілі у Менск даведывацца аб гэтым. Усіх зацікавіло тое, што гаварылі там аб беларускіх школах і вельмі добра было-б, каб у нашай ваколіцы былі беларусы вучыцялі.

Беларуская справа зацікавіло тутэйшых селян яшчэ с прошлаго году, калі у Альковічах у касьцёле прыехаўшы з Менску кс. Гадлеўскі гаварыў казанне на беларуску. Каб часьцей бывалі у нас прэдстаўнікі беларускаго духавенства, гэтым яны бы шмат зрабілі-б у беларускай справе.

У мястэчку Крайску (10 вёрст ад нашаго мястэчку) адзін лютэранін расійскі падданы прыняў жыдоўскую веру і жэніцца з жыдоўскай дзяўчынай.

У ваколічных мястэчках, наагул запанавалі болей гуманныя погляды у адносінах да другіх вер.

Па розных мястэчках праэктуюцца адкрыцці розных сярэднія школ. Вельмі жадана было-б, каб беларускія дзеячы у Менску зацікаваліся болей беларускай правінцыяй і каб па розных мястэчках уладжывалі беларускія гімназыі на кіпталт будслаўскай. Жыхары мястэчак і селян пайшлі-б з ахвотай на сустрэч грошавымі і інш. дапамогамі.

Усе рвуцца у нашых ваколічных вёсках і мястэчках да навукі толькі бракуе людзей з арганізатарскімі талентамі, каторыя узяліся-б энэргічна за гэту вельмі патрэбную працу.

М. Плаунік.

МЯСТЭЧКА МАЛАДЭЧНА. (*Ад нашаго кор-та*). С першых дзён леташняго 1917 году залажылося тут коапэратыўнае таварыство і заклало сумесную краму «Зара». Сёлета 3 ліпня зроблена справаздача. За поўтара годы жыцця таварыства 6.000 рублёў екладкі далі чыстаго даходу 53.623 руб. 24 кап. З гэтай сумы 20% (10.652 р. 65 к.) залічаны ў запасны капітал, а 10% (5.326 р. 32 к) у фундушовы капітал. І запасны капітал і фундушовы пастанавілі пусьціць у зварот на тавары. Згодна с пастановай сябраў 20.000 руб. вызначэно на закладзіны пачатковых школ ува ўсей воласьці. Таварыство шчыра дзякуе Віктару Протасу, быўшаму пачтоваму мэханіку, глаўнаму кіраўніку крамы «Зара», што сваей жывой працай змог умацаваць і пашырыць работу таварыства. Сьвятлейшымі тут людзьмі робіцца старанне, каб злучыць разам суседнія коапэратывы ў саюз Маладэчненскаго округу.

Падпісалі: Старшыня таварыства Я. Ластоўскі. Пісар Міхалоўскі.

СМАРГОНІ. (*Ад нашаго кор—та*). Тут, як кажуць, вялізарныя лясы на многа тысяч дзесяцін паміж Смаргонямі і Біняконямі, некалі належаўшыя да казны, прададзены г[illegible] дрэва лясным купцом. Хто гэта зрабіў, напэуна нівядома, кажуць, што гэта работа земства. Калі гэта праўда, ды нельга даволі надзівіцца падобнай гаспадарцы: нават дзіцяці вядома, што як раз у гэтых ваколіцах доўгім поясам цягнуцца ваенные пазыцыі і з гэтай прычыны ўсе вёскі, мястэчкі, двары і сялібы даўным-даўно зьнішчэны гарматамі, стрэламі, або агнём. Народу патрэбен лясны матэр'ял, каб адбудавацца, — тут ім пад носам маняцца вывазіць нет водама куды ўвесь запас дрэва.

Калі ўсе гэтыя гутаркі — праўдзівыя, дык будзем спадзевацца, што гэтай справай займецца беларускі ўрад у Мінску, бо ж нельга рабіць гэткай страшэннай крыўды людзём і без таго цяжка пацярпеўшым ад вайны.

СЬВІСЛАЧ. 9 і 10 жніўня тут адбываліся выпускныя экзамены для вучняў чацьвёртага элемэнтарнаго курсу беларускай вучыцельскай сэмінарыі.

«Гоман».

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 15 жніуня. 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

Разведачная ажыўлёная дзеяльнасьць між рэкамі Ізэр і Скарп. Да паўднёва усходу ад Айет часьцічная атака ангельцаў перад нашымі лініямі была адбіта. Да поўначы ад р. Анкр у працяг апошніх начэй мы ачысьцілі выступаўшую часьць пазыцыі паміж Пюізье і Бомон—Амэль. Ён заняты праціўнікам.

Група арміі Бэна.

Ніякіх вялікіх баявых дзеяў. У вочары усілілася агнёвая дзеяльнасьць паміж Анкр і Уаз. На абедзьвых старанах Аўры і паўднёвей часьцічныя варожыя атакі.

Група арміяу Гэрманскаго Кронпрынца.

У часе атакі на паўднёвы берага р. Вэль мы захапілі у палон варожы атрад займаўшаго вакзал Брэйль.

Нашыя самахватныя лятуны астанавілі ляцеўшую ангельскую бомбаметнаую эскадру, па напрамку на Германію раней чым яна дайшла мэты і зьбіушы пяць самалётау прымушалі яе вярнуцца.

Учора былі зьбіты 24 варожыя самалёты і адзін прывязны шар.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **Людэндорф**.

Рэдактар **А. Прушынскі.**
Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грынблата.